немецкую шпионку Гончарову Екатерину», в которой описывалась история ее внедрения в бригаду и последующего побега [14, л. 93–93 об.].

- количество разоблаченных и вывезенных агентов. В этих документах приводились, как правило, количественные показатели взятой на учет и разоблаченной агентуры. В качестве примера приведем справку «О количестве вывезенных из тыла противника особо важных разведчиков, шпионов и диверсантов», где указывалось, что «только за 1943/1944 гг. партизанскими бригадами выявлено на оккупированной территории Беларуси до 2200 вражеских агентов, из них разоблачено и расстреляно 1219 человек, остальные активно разыскиваются [9, л. 392].

Подводя итог, можно говорить о том, что справочно-информационная документация БШПД и различных партизанских органов и формирований является ценным источником по вопросу деятельности немецких разведывательно-диверсионных школ на территории Беларуси в 1941–1944 гг. К сожалению, в настоящее время можно констатировать, что данный вид документации мало используется в исследованиях.


1. Белик, И.К. Немецкая разведка является довольно сильным противником / И.К. Белик // Исторический архив. – 2000. – № 5 – С. 27–63.
2. Лубянка в дни битвы за Москву: Материалы органов госбезопасности СССР из Центрального архива ФСБ России. – М. : Издательский дом «Звонница МГ», 2002. – 480 с.
3. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 1350. Оп. 1. Д. 38.
4. НАРБ. – Ф. 1405. Оп. 1. Д. 139.
5. НАРБ. – Ф. 1440. Оп. 1. Д. 788.
6. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 27.
7. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 55.
8. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 56.
9. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 57.
10. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 58.
11. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 60.
12. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 1297.
13. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 1311.
14. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 1326.
15. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 1329.
16. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2. Д. 1336.
17. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 21. Д. 1.
18. «Огненная дуга». Курская битва глазами Лубянки / сост. А.Т. Жадобин, В.В. Марковчин, В.С. Христофоров. – М.: АО «Московские учебники и Картолитография», 2003. – 480 с.
19. Органы государственной безопасности СССР в Великой Отечественной войне. Т. 3: Крушение “Блицкрига”, кн. 1: 1 января – 30 июня 1942 г. – М. : Русь, 2003. – 691 с.; Т. 4: Секреты операции «Цитадель», кн. 1: 1 января – 30 июня 1943 г. – М. : Русь, 2008. – 813 с.; Т. 4: Великий перелом, кн. 2: 1 июля – 31 декабря 1943 г. – М. : Русь, 2008 – 814 с.; Т. 5: Вперед на запад, кн. 1: 1 января – 30 июня 1944 г. – М. : Кучково поле, 2007. – 752 с.


**Крыварот А.А.**

## ЗБОРНІК ДАКУМЕНТАЎ І МАТЭРЫЯЛАЎ «ЗИМНЕЕ ВОЛШЕБСТВО» ЯК КРЫНІЦА ДАСЛЕДАВАННЯ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ПАРТЫЗАН ВІЦЕБСКАЙ І КАЛІНІНСКАЙ АБЛАСЦЕЙ СУПРАЦЬ КАРНАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ ЛЮТАГА – ПАЧАТКУ САКАВІКА 1943 г.

Партызанам Віцебскай і Калінінскай абласцей у 1943 г. даводзілася неаднаразова сумесна адбіваць карныя экспедыцыі германскіх акупацыйных войск. Адной з найбольш буйных і працяглых карных акцый была экспедыцыя пад кодавай назвай «Зімовае чараўніцтва» (14.02–20.03.1943).

Тэма баявога ўзаемадзеяння партызан падчас гэтай карнай экспедыцыі знайшла пэўнае адлюстраванне ў манаграфіях, калектыўных працах, зборніках дакументаў і матэрыялаў, мемуарнай літаратуры [1; 2; 3; 4; 6; 7; 10; 11; 14; 15; 16].

Разам з тым у публікацыях недастаткова раскрыты падыходы падпольных партыйных органаў і камандзіраў да праблемы каардынацыі баявымі дзеяннямі беларускіх і калінінскіх партызанскіх брыгад. У гістарыяграфіі па гэтай тэматыцы павярхоўна паказаны ўдзел у кіраванні партызанскімі сіламі асоб, вызначаных для выканання такой функцыі Цэнтрам і рашэннем нарады каманднага складу.

Недахопы ў навуковым раскрыцці праблемы шмат у чым тлумачацца недастатковым выкарыстаннем архіўных дакументаў, у якіх утрымліваецца інфармацыя па ўказанай тэме. Выпраўленню прабелаў у асвятленні баявой садружнасці партызан, несумненна, будуць садзейнічаць дакументы і матэрыялы, змешчаныя ў зборніку «Зимнее волшебство» [5].

Репозиторий ВГУ

Кніга ўтрымлівае больш за дзвесце дакументаў з архіваў Беларусі, Расійскай Федэрацыі, Латвіі і з'яўляецца найбольш поўным зборам інфармацыі аб трагічных падзеях, якія адбываліся ў лютым – сакавіку 1943 г. на тэрыторыі Асвейскага, Дрысенскага, Расонскага і Себежскага раёнаў. У значнай колькасці дакументаў – загадах, справаздачах, данясеннях, шыфраграмах, радыёграмах штабоў партызанскага руху, падпольных органаў КП(б)Б, камандзіраў і начальнікаў штабоў брыгад – адлюстравана сумесная баявая дзейнасць брыгад Віцебскай і Калінінскай абласцей па адбіцці наступлення акупантаў з боку латышскай мяжы. Дакументы размешчаны ў храналагічным парадку, што дае магчымасць прасачыць дынаміку разгортвання барацьбы партызан супраць карнікаў.

Па нашых падліках, у больш чым 40 дакументах ёсць звесткі аб сумесных баях брыгад Віцебскай і Калінінскай абласцей з праціўнікам у адзначаны перыяд. Сюды ўваходзяць і матэрыялы, прысвечаныя пытанням вызначэння парадку камандавання партызанскімі фарміраваннямі ў паласе наступлення праціўніка. Праблема кіраўніцтва была ўпершыню ўзнята 23 лютага 1943 г. (на сёмы дзень ад пачатку карнай акцыі) у радыёграме адказнага арганізатара Віцебскага абкама КП(б)Б па рабоце сярод партызан Б.І. Мажайскага на адрас П.К. Панамарэнкі. Паведамлялася, што надзвычай цяжкая абстаноўка ў раёне баёў з карнікамі выклікае неабходнасць прызначэння ад імя начальніка ЦШПР аднаго з камбрыгаў для каардынацыі дзеянняў усіх партызанскіх фарміраванняў. Па меркаванні Б.І. Мажайскага, гэта магла б быць кандыдатура выконваючага абавязкі камандзіра брыгады «За Савецкую Беларусь» А.В. Раманава. У той самы дзень сам А.В. Раманаў накіроўвае радыёграму П.К. Панамарэнку і называе дзве ўмовы разгрому праціўніка: забеспячэнне патронамі і цэнтралізаванае камандаванне, калі не ўсімі, то ў крайнім выпадку беларускімі брыгадамі [5, с. 57].

Дакументы зборніка сведчаць аб тым, што наступныя некалькі дзён А.В. Раманаў і Б.І. Мажайскі працягвалі ўздымаць перад Цэнтрам пытанне аб кіраўніцтве баявымі дзеяннямі брыгад. Так, 25 лютага А.В. Раманаў звяртаецца да намесніка прадстаўніка ЦШПР на Калінінскім фронце П.С. Шаламагіна з настойлівай просьбай выдачы катэгарычнага загаду Цэнтра аб падпарадкаванні ўсіх брыгад адной асобе, што будзе садзейнічаць устанаўленню ваеннай дысцыпліны. У наступным данясенні А.В. Раманава на адрас П.С. Шаламагіна ўтрымліваецца каштоўная інфармацыя аб сумесных баях, пачынаючы з 15 лютага, у якіх узамадзейнічалі беларускія брыгады А.В. Раманава, І.К. Захарава, Р.П. Герасімава і брыгада Калінінскай вобласці на чале з С.У. Грабёнкіным. Пры гэтым была выказана прапанова аб неабходнасці прызначэння адказнага камбрыга па размеркаванні боепрыпасаў. У сваёй кароткай радыёграме ў Цэнтр 25 лютага Б.І. Мажайскі інфармаваў начальніка ЦШПР аб змаганні беларускіх брыгад А.В. Раманава, І.К. Захарава, Р.П. Герасімава супраць карнікаў у раёне вёсак Гараваткі, Нарубін, Выдрыцкія і адзначаў, што калінінскія брыгады, маючы боепрыпасы, самаўхіляюцца ад баёў з акупантамі. Партыйны работнік прасіў П.К. Панамарэнку даць адказ на сваю тэлеграму ад 23 лютага, у якой была ўзнята праблема каардынацыі сумеснай барацьбы беларускіх і калінінскіх брыгад з карнікамі [5, с. 65–66].

Паводле дакументаў зборніка, першыя ўказанні аб аб'яднанні партызанскіх сіл паступілі з Цэнтра толькі на дзясяты дзень разгортвання карнай акцыі. У шыфртэлеграме ад 26 лютага С.С. Бельчанка дакладваў П.К. Панамарэнку аб сваім указанні брыгадам Калінінскай вобласці на чале з В.М. Лісоўскім, М.І. Каранавушанкам, М.М. Вараксавым, С.У. Грабёнкіным застацца ў зоне баёў і разам з беларускімі брыгадамі разграміць групоўку праціўніка. У той самы дзень С.С. Бельчанка накіраваў у зону баёў радыёграму аб ускладанні на А.І. Штрахава абавязкаў па камандаванні ўсімі калінінскімі брыгадамі і неабходнасці ўзаемадзеяння з беларускімі партызанамі [5, с. 65–66, 313].

Пры аналізе змешчанага ў зборніку баявога загада № 1 па разгроме карнай экспедыцыі ад 27 лютага 1943 г. звяртае на сябе ўвагу тое, што ён падпісаны А.І. Штрахавым як камандуючым аб'яднанымі калінінскімі і беларускімі брыгадамі. Аднак тут няма асобнага дакумента, які б сведчыў, што А.І. Штрахаву было таксама нададзена права кіраваць баявымі дзеяннямі і беларускіх брыгад. У даведцы Калінінскага штаба партызанскага руху ад 18 верасня 1944 г. толькі коратка згадваецца, што камандзіры беларускіх брыгад у лютым (дата не ўказана) на сумеснай нарадзе вырашылі ўвайсці таксама ў падпарадкаванне А.І. Штрахава. Аднак у шыфртэлеграме Б.І. Мажайскага начальніку БШПР П.З. Калініну ад 27 лютага 1943 г. зноў выказана просьба ўскласці на А.В. Раманава абавязкі на кіраўніцтве разгромам карнікаў. Яшчэ адна шыфртэлеграма з просьбай прызначыць А.В. Раманава начальнікам аператыўнай групы па кіраўніцтве партызанскім рухам на месцы баёў была накіравана начальнікам штаба брыгады «За Савецкую Беларусь» У.Н. Дармянёвым Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму [5, с. 69, 71, 72, 314].

Рэпазіторый ВДУ

У сувязі з тым, што ў зборнік уключаны не ўсе дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, якія непасрэдна датычацца праблемы кіраўніціва, ёсць патрэба пра асобныя з іх нагадаць. У адным з палітданясенняў брыгады «За Савецкую Беларусь» указана, што яшчэ да атрымання 26 лютага загада ад С.С. Бельчанкі аб кіраўніцтве калінінскімі брыгадамі А.І. Штрахаў на нарадзе камандзіраў беларускіх брыгад быў выбраны каардынатарам баявых дзеянняў. Такая інфармацыя маецца і ў шэрагу іншых архіўных дакументаў. Таму цяжка зразумець, чаму Б.І. Мажайскі і У.Н. Дармянёў у радыёграмах ад 27 лютага прасілі ўскласці на А.В. Раманава паўнамоцтвы кіраўніка брыгадамі ў зоне баёў [9, л. 138; 12, л. 10; 13, л. 156].

Аналіз дакументаў зборніка дазваляе сцвярджаць, што праблема кіраўніцтва партызанскімі фарміраваннямі знаходзілася ў полі зроку начальніка ЦШПР. У радыёграме П.К. Панамарэнкі ад 1 сакавіка 1943 г. камандаванне беларускімі і калінінскімі атрадамі ў зоне баёў ускладвалася на А.Ф. Бардадына (упаўнаважаны БШПР), А.В. Раманава і А.І. Штрахава. Адначасова ўдакладнялася, што гэта не павінна весці да аб'яднання брыгад ці аб'яднаўчых абарончых баёў. Такім чынам, канчатковае рашэнне па парадку кіраўніцтва партызанскімі сіламі прыняў П.К. Панамарэнка [5, с. 78–79].

У шэрагу дакументаў зборніка прысутнічае інфармацыя аб баявым узаемадзеянні беларускіх і калінінскіх брыгад ужо пасля прыняцця рашэнняў аб кіраўніцтве партызанскімі сіламі. У шыфртэлеграме С.С. Бельчанкі начальніку ЦШПР ад 2 сакавіка пададзена інфармацыя аб сумесных баях атрадаў 4-й, 11-й Калінінскіх брыгад і двух падраздзяленняў Расонскай брыгады ў раёне вёскі Гарадзілавічы супраць карных падраздзяленняў. У радыёграме Б.І. Мажайскага адзначалася, што першыя дні сумесных дзеянняў далі тую перавагу, што асноўныя сілы праціўніка скаваны і ён не прасоўваецца наперад. У данясенні Б.І. Мажайскага можна паставіць пад сумненне інфармацыю аб тым, што А.В. Раманаў разам са А.І. Штрахавым прымаў удзел у камандаванні партызанскімі сіламі па разгроме карнікаў. Паводле ўспамінаў А.В. Раманава, ён самаўхіліўся ад выканання такіх абавязкаў, бо пасля праяўлення ініцыятывы падчас барацьбы з карнай экспедыцыяй «Заяц-бяляк», па яго меркаванні, была створана пэўная атмасфера недаверу да яго з боку А.І. Штрахава, а пазней і А.Ф. Бардадына. Аналагічныя сведчанні ўтрымліваюцца і ў асобных архіўных дакументах, не ўключаных у дадзены зборнік. Пра няўдзел А.В. Раманава ў кіраўніцтве згадана і ва ўводзінах да зборніка [5, с. 20, 84–85, 88, 89, 107–108, 113–114; 9, л. 138; 12, л. 10–11; 13, л. 156; 14, 250–253].

К канцу першай дэкады сакавіка 1943 г. праціўнік прыпыніў наступленне і пачаў праводзіць перагрупіроўку сіл. А.І. Штрахаў, зыходзячы са свайго бачання абстаноўкі, выдаў 9 сакавіка баявы загад № 4 аб немэтазгоднасці знаходжання ў Дрысенскім і Асвейскім раёнах такой колькасці партызан. Брыгадам прадпісвалася вярнуцца ў раёны сваёй ранейшай дыслакацыі і прыступіць да правядзення дыверсій на камунікацыях. Беларускім брыгадам Р.П. Герасімава, І.К. Захарава, А.В. Раманава ставілася задача раптоўнымі нападамі і засадамі не дапускаць знішчэння населеных пунктаў і прасоўвання праціўніка на ўсход ад шашы Себеж – Дрыса на ўчастку Царкоўна – Востры Канец. Паводле загаду калінінскія брыгады ў ноч на 10 сакавіка (па іншых звестках 5–7 сакавіка) пакінулі свае пазіцыі на паўночным участку абароны і выйшлі ў напрамку Пустошкі. Ад гэтага часу беларускія партызаны пад камандаваннем А.Ф. Бардадына з 11 сакавіка і да канца другой дэкады месяца трымалі абарону на рацэ Свольна і ажыццяўлялі контратакі на тылавыя аб'екты гітлераўцаў [5, с. 117, 130–131, 315].

Ва ўводзінах да зборніка адзначана, што А.І. Штрахаў не зусім дакладна ацаніў сітуацыю, звязаную з заціішшам у раёне баявых дзеянняў, і таму вывеў калінінскія брыгады з Асвейскага раёна. З такой ацэнкай дзеянняў А.І. Штрахава можна пагадзіцца толькі часткова. Па-першае, у данясенні С.С. Бельчанку ад 13 сакавіка А.І. Штрахаў паведамляў, што беларускія брыгады з устанаўленнем лётнага надвор'я і прыбыццём у ноч з 7 на 8 сакавіка А.Ф. Бардадына ў партызанскую зону атрымалі самалётамі і планерамі вялікую колькасць боепрыпасаў (каля 800 тыс. патронаў), вінтоўкі і аўтаматы. Па-другое, сцвярджалася, што беларускія брыгады займаюць практычна ўсю лінію абароны. У некаторых архіўных дакументах выхад калінінскіх партызан з зоны баёў звязваецца з наступленнем цёплага надвор'я і пагрозай паводкі, што магло сур'ёзна паўплываць на тэрміны вяртання брыгад у раёны ранейшай дыслакацыі. Акрамя таго, у калінінскіх брыгадах адчуваўся вялікі надахоп боепрыпасаў [5, с. 117, 130–131, 315; 8, л. 85–86; 12, л. 11].

Такім чынам, у зборніку дакументаў і матэрыялаў «Зимнее волшебство» змешчаны значны пласт важнай інфармацыі аб узаемадзеянні партызан Віцебскай і Калінінскай абласцей пры адбіцці



Репозиторий ВГУ

наступальных дзеянняў карнікаў у перыяд з 16 лютага да 10 сакавіка 1943 г. Нягледзячы на гэта, для больш глыбокага даследавання праблемы варта выкарыстоўваць дадатковыя звесткі з фондаў 4п, 1336, 1391, 1403, 1450 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

1. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / Л. Аржаева [и др.] ; редкол. : А.Т. Кузьмин [и др.] – Минск: Беларусь, 1983–1985. – Т. 2 / Л. В. Аржаева [и др.] ; редкол.: А.А. Филимонов [и др.]. – 1984. – 551 с.
2. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : документы и материалы : в 3 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Ин-т истории АН БССР. – Минск : Беларусь 1967–1982. – Т. 2 : Развитие всенародного партизанского движения во второй период войны. – Кн. 1. (ноябрь 1942 – июнь 1943) / сост. Г. Н. Шевела [и др.]. – 1973. – 680 с.
3. Жилянин, Я.А. Без линии фронта / Я.А. Жилянин, И.Б. Позняков, В.И. Лузгин. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск : Беларусь, 1979. – 382 с.
4. Захаров, И.К. Война в краю озер / И.К. Захаров. – 2-е перераб. и доп. изд. – Минск : Беларусь, 1973. – 319 с.
5. «Зимнее волшебство». Нацистская карательная операция в белорусско-латвийском пограничье, февраль – март 1943 г.: Документы и материалы. – М. : Фонд «Историческая память», 2013. – 512 с.
6. Макаров, Н.И. Непокорённая земля российская. / Н.И. Макаров. – М.: Политиздат, 1976. – 319 с.
7. Макаров, Н.И. Партизанские были / Н.И. Макаров. – Калинин, 1959. – 136 с.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 180.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 72.
10. Народная война в тылу врага: к истории партизанского движения в Калин. обл. / редкол. : И.С. Борисов [и др.]. – М. : Моск. рабочий, 1971.–328 с.
11. Подвиги народных мстителей : партизанское движение Калининской обл. 1941–1944 гг. : документы и материалы. – М. : Моск. рабочий, 1966. – 399 с.
12. Политдонесение о морально-политическом состоянии, партийно-политической работе и боевой деятельности бригады «За Советскую Белорусь» им. Рокоссовского за период с 1 сентября 1942 г. по 31 марта 1943 г. // НА РБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 180. Л. 1–15.
13. Политдонесение о морально-политическом состоянии, партийно-политической работе и боевой деятельности партизанской бригады «За Советскую Беларусь» – им. Рокоссовского за период с 1 декабря 1942 г. по 31 марта 1943 г. // НА РБ. – Ф. 1450. Воп. 2. Спр. 920. Л. 151–159.
14. Романов, А.В. На земле непокоренной. Записки партизана / А. В. Романов. – Минск : Госиздат, 1962. – 297 с.
15. Сарченко, Г.Ф. В огне народной войны / Г.Ф. Сарченко. – Псков, 1962. – 164 с.
16. Сарченко, Г.Ф. В строю бессмертных / Г.Ф. Сарченко. – Псков, 1964. – 276 с.

**Мизис Ю.А.**

## ВОЕННЫЙ ПЛЕН В ГОДЫ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ НА ТЕРРИТОРИИ СССР: ИСТОЧНИКОВЕДЧЕСКИЙ АСПЕКТ
### (по материалам лагерей военнопленных Тамбовской области)[1]

Интерес к проблеме плена в годы Второй мировой войны не ослабевает как в России, так и в Западной Европе. Об этом говорят многочисленные публикации, проведение крупных международных конференций [12, 14, 15]. Конференция, прошедшая в августе 2016 г. в Тамбове с участием большой группы западноевропейских исследователей и ученых из России, служит тому красноречивым подтверждением [9]. Изучая данную проблему, исследователи особое внимание уделяют поиску новых источников и методике их научной обработки. Важное место занимают фонды региональных архивов, где хранятся документы отдельных лагерей и Управлений НКВД по делам военнопленных и интернированных конкретных областей. Значительный пласт таких документов находится в фондах Российского государственного военного архива (Москва), которые во многом дополняют региональные фонды. Мы рассмотрим характер этих массовых источников на примере лагерей военнопленных, действовавших на территории Тамбовской области: № 64 (Моршанск) и № 188 (Рада). Наиболее изучен лагерь № 188, что во многом объясняется его многонациональным составом и интересом к этой проблеме историков разных стран [1, 2, 8, 10]. По нашим подсчетам, в лагере № 188 были представлены пленные около 40 национальностей. В меньшей степени изучена история лагеря № 64, что объясняется отсутствием отдельного фонда и значительным разбросом документов по разным архивам и фондам. Лагерь № 188 на станции Рада был образован 31 января 1942 г. как фильтрационный лагерь для советских военнослужащих, вышедших из окружения или немецкого плена. С 1 декабря 1942 г. он поменял свой профиль и превратился в лагерь для военнопленных немецкой армии и армий союзников Германии. Лагерь № 64 был создан специальным указом УНКВД по Тамбовской области от 11 марта 1943 г.

В состав источников входят документы регулярной отчетности руководства лагерей. Важную информацию содержат «Доклады о санитарно-бытовым состоянии лагеря» и «Доклады

[1] Статья выполнена при финансовой поддержке РГНФ, Грант № 16-11-68005 а (р)



Репозиторий ВГУ